

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *БЛАНК ЗАДАННЯЎ*
## 11 клас

*Як вы думаеце, сябры, дзе знаходзіцца мост паміж эпохамі? Дзе гісторыя ажывае, каб фарміраваць нашу рэчаіснасць? Вядома ж, у музеі! Яго сэрца – мова і літаратура, паколькі праз рукапісы, кнігі і лісты мы чуем галасы продкаў, і музей становіцца сховішчам не толькі рэчаў, але і душы народа.*

*Прапануем вам філалагічнае знаёмства з музейнай справай, каб далучыцца да беларускай культурнай спадчыны.*

## Варыянт 1

**Заданне 1.** Супрацоўнікі музеяў займаюцца надзвычай складанай, але вельмі карыснай і цікавай справай і ўжываюць пры гэтым адпаведныя спецыяльныя словы.

Запішыце лексіку музейнай справы згодна з нормамі беларускага правапісу.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 2.** У музейнай справе важна правільна выбраць экспанаты для калекцыі і размясціць іх у такім парадку, каб яны дакладна адпавядалі тэме экспазіцыі.

Ніжэй размешчаны “экспанаты” – лексічныя значэнні слоў. Размясціце іх (запішыце нумар) на асобных palічках у адпаведнасці з назвамі палічак.

Майце на ўвазе, што на кожнай палічцы можа стаяць толькі адзін “экспанат”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1** аддзяліць пэўную колькасць чаго-н., утрымаць з якой-н. сумы | **2** стаць прыдатным да ўжывання ў выніку варкі | **3** распачынаць сварку з кім-н., лаяцца з кім-н., крычаць на каго-н. | **4** апрацоўваць зямлю плугам |
| **5** заўважыць розніцу паміж прадметамі, з’явамі; распазнаць, вылучыць | **6** махлярства, здрадніцтва (разм.) | **7** які не нясе адказнасці ні перад кім | **8** верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання |
| **9** нястача, адсутнасць, недахоп чаго-н. | **10** у такой меры, у такой ступені | **11** прычына, абставіны, якія робяць зразумелымі ўчынкі каго-н. | **12** сямейны саюз мужчыны і жанчыны |

**Заданне 3.** Музеі захоўваюць матэрыяльную спадчыну беларусаў, пераносячы нас у свет дзівосных рэчаў, на якіх калісьці трымалася жыццё нашага народа. Фразеалогія ж прыадчыняе перад намі дзверы ў духоўнае мінулае нашых продкаў, паказваючы, як яны ўспрымалі свет, якімі каштоўнасцямі жылі. Таму веданне фразеалагізмаў – яскравае сведчанне прылучанасці чалавека да сваёй культуры.

Прадэманструйце, як вы валодаеце беларускай фразеалогіяй: у пададзеных фразеалагізмах вызначце прапушчаны кампанент, выбраўшы яго з прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў апошнім слупку знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 4.** Экспанаты ў музейных залах і на паліцах заўсёды размяшчаюцца на падставе дэталёвага ўліку суадносін паміж імі. Гэтаксама скрупулёзна мовазнаўцы вызначаюць адносіны вытворнасці паміж словамі.

Вам прапанаваны шэсць дзеясловаў. Адзін з іх мае два вытворныя простыя прыметнікі, чатыры – па адным, а яшчэ адзін вытворных прыметнікаў не мае. З улікам пададзенай інфармацыі паспрабуйце і вы да прапанаваных дзеясловаў дакладна падабраць усе магчымыя вытворныя ад іх простыя прыметнікі. Запішыце іх у адпаведных радках табліцы (у адным з радкоў пастаўце прочырк).

***Заўвага***. Прыметнік можна падбіраць зыходзячы з любога значэння дзеяслова.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Заданне 5.** Давайце пазнаёмімся з адным з найбольш цікавых беларускіх музеяў. Прачытайце тэкст пра ўнікальны літаратурны музей Максіма Гарэцкага, які знаходзіцца ў вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага раёна, і запоўніце ячэйкі табліцы зыходзячы з пастаўленай у кожнай ячэйцы задачы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*



Літаратурны музей Максіма Гарэцкага ў вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага раёна быў адкрыты ў 1989 годзе. Хата, дзе М. Гарэцкі нарадзіўся і пражыў палавіну жыцця, ***амаль поўнасцю***[1] згарэла. Засталіся ***толькі пляцоўка***[2], падворак і частка саду. Музей размясціўся ***ў аднаўленай хаце***[3], што ўяўляе вясковую жылую пабудову ў традыцыях канца XIX стагоддзя і складаецца ***з трох частак***[4]: цёмнай і светлай хаты і сяней.

Экспазіцыйная плошча – 79,1 м². Размешчаная ў 2-х залах экспазіцыя мае літаратурную частку, якая адлюстроўвае асноўныя этапы творчай біяграфіі пісьменніка, і этнаграфічную, якая ***ўключае ў інтэр’ер***[5] дакументальны матэрыял.

У кожнай экспазіцыі дэманструюцца арыгінальныя матэрыялы і копіі, у тым ліку пачатку мінулага стагоддзя: фотаздымкі, дакументы, ***рукапісы твораў***[6], кнігі, газетныя нататкі, паштоўкі, лісты. Сярод экспанатаў – кнігі М. Гарэцкага, літаратуразнаўчыя даследаванні спадчыны братоў Гарэцкіх XX – пачатку XXI стагоддзя, зборнікі Міжнародных Гарэцкіх чытанняў, успамінаў і інтэрв’ю, фотаздымкі. *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў.)*

**Заданне 6.** Устанавіце адпаведнасць паміж выдзеленымі ў тэксце папярэдняга задання словазлучэннямі (спалучэннямі слоў) і іх характарыстыкамі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1Б2В3). Улічыце, што не ўсе словазлучэнні (спалучэнні слоў) могуць адпавядаць акрэсленым патрабаванням, а таму могуць быць пазіцыі без правільнага адказу.

***Характарыстыкі:***

А – Дапасаванне, сінтаксічна несвабоднае.
Б – Дапасаванне, сінтаксічна свабоднае.
В – Складанае словазлучэнне.
Г – Кіраванне прыназоўнікавае.
Д – Прымыканне.
Е – Не словазлучэнне.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*



Музей истории Городницы посвящен реформаторской деятельности подскарбия надворного ВКЛ Антония Тизенгауза в Гродно. Ежегодно музей посещают свыше 150 тысяч человек, проводится более 2 тысяч экскурсий. Основной фонд музея составляют 172 137 единиц хранения. В составе музейного собрания – богатые археологические коллекции, документы и старопечатные издания. Значительный интерес представляет собрание оружия и военного снаряжения X–XX вв. *(По материалам сайта www.history.grodno.museum.by.)*

**Заданне 8.** Нарэшце мы паспрабуем зрабіць уласны віртуальны музей беларускай літаратуры і мастацтва.

У нашым віртуальным музеі ёсць раздзел, прысвечаны такому літаратурнаму напрамку, як рамантызм. Наша першая задача – стварыць галерэю ілюстрацый, якія б давалі ўяўленне пра гэты напрамак. Тут нам дапамог штучны інтэлект, што стварыў шэраг ілюстрацый. Адбярыце тыя, якія найбольш характарызуюць рамантызм, і ўпішыце іх нумары ў рамкі. Некаторыя рамкі могуць заставацца пустымі.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

*Ілюстрацыі для выбару*

| Нумар | Ілюстрацыі | Нумар | Ілюстрацыі |
|---|---|---|---|
| 1 | <br>*Жанры балада, паэма, элегія, раман* | 6 | <br>*Супрацьстаянне дасканалага ідэальнага і недасканалага рэальнага свету* |
| 2 | <br>*Выключная асоба, герой-бунтар* | 7 | <br>*Максім Багдановіч* |
| 3 |  | 8 |  |
| 4 | <br>*Тыповы чалавек у тыповай сітуацыі* | 9 | <br>*Адзінства часу, месца, дзеяння* |
| 5 | <br>*Мазаічная кампазіцыя і цытатнасць* | 10 | <br>*Адстойванне нацыянальных традыцый, мовы, культуры* |

**Заданне 9.** Другая задача – адрэдагаваць тэкст, змешчаны ў раздзеле “Кузьма Чорны”. Уважліва прачытайце прапанаваны урывак. На месцы пропускаў упішыце неабходную інфармацыю і папраўце памылкі там, дзе палічыце патрэбным (закрэсліце памылковыя сцверджанні і зверху напішыце правільныя).

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Заданне 10.** Трэцяя задача. У нашым віртуальным музеі ёсць інтэрактыўны раздзел, прысвечаны вершу, у якім ёсць наступная страфа:

*Пялёсткамі тваімі стану,*
*на дзіды сэрца накалю.*
*Тваіх вачэй – пад колер сталі –*
*праменне яснае люблю.*

Успомніце, што гэта за верш і хто яго аўтар (падказка: сёлета будзе адзначацца 125-я гадавіна з дня яго нараджэння). Падумайце, якія тры “экспанаты” маглі б праілюстраваць верш. Напішыце тэкст аўдыягіда, у якім бы цікава і арыгінальна былі прадстаўлены вашы “экспанаты”. Выкарыстанне нестандартных ідэй, яркіх вобразаў вітаецца. Тэкст не павінен быць большым за 100 слоў. Поспехаў!

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*